**Бароўская В.М.**

# БЕЛАРУСКАЕ ПЫТАННЕ ПАДЧАС ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ 1919–1920 гг. НА СТАРОНКАХ “KURJER POLSKI”

“Kurjer Polski” – штодзённая газета, якая выдавалася ў Варшаве ў 1898–1939 гг. Па сваёй ідэйна-палітычнай накіраванасці была прыбліжана да лагера прыхільнікаў Ю. Пілсудскага. Рэдакцыйна-адміністрацыйны аддзел газеты знаходзіўся ў Варшаве. Таксама выданне мела філіялы ў Лодзі, Влацкаўцы. Разам з выданнямі Rząd i Wojsko”, “Kurjer Porany”, “Przegląd Wieczorny”, “Wyzwolenie”, “Niedolę Chłopską”, “Robotnik”, “Tribunę”, “Przedświt”, “Sprawę Robotniczą” выступала ў патрымку ідэі федэралізацыі “ўсходняга пытання”, настойвала на рэалізацыі права на самавызначэнне для народаў, што пражывалі на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, у першую чаргу літоўска-беларуска-ўкраінскага рэгіёна. Асновай польскай палітыкі да гэтых народаў павінен стаць прынцып “вольны з вольнымі, роўны з роўнымі”. Прадугледжвалася “стварэнне незалежнай Украіны, Беларусі і іншых рэспублік, якія павінны стаць буферам, які забяспечыць Польшчу ад нападу Савецкай Расіі” [5, s. 559–600].

На старонках газеты, акрамя надзённых сталічных навін, знаходзіла свае адлюстраванне і беларускае пытанне. Так, 1 лістапада 1919 г. быў размешчаны артыкул “Беларусь жадае жыць і ваяваць разам з Польшчай”. У цэнтры ўвагі адзначанага матэрыялу пастаўлена праблема стварэння Беларускай Вайсковай камісіі і беларускіх вайсковых фарміраванняў, падпарадкаваных польскаму галоўнаму камандванню [8, s. 4]. Як вядома, Беларуская Вайсковая камісія была створана 2 жніўня 1919 г. і фармальна падпарадкоўвалася Цэнтральнай радзе Віленшчыны і Гродзеншчыны. У артыкуле паведамляецца, што асноўнай задачай камісіі стала распрацоўка праекта арганізацыі беларускіх ўзброенных частак у складзе польскага войска і тэкста звароту да польскіх уладаў. У далейшым камісія павінна была дзейнічаць пры польскім Галоўным камандванні, а таксама мець прадстаўнікоў ва ўсіх галінах вайсковай гаспадаркі, якія б тычыліся беларускіх частак. Камісія павінна была б прапаноўваць кандыдатуры афіцэраў для беларускага войска, зацвярджаць пастановы польскага Галоўнага камандвання аб іх прызначэнні ці звальненні. Аўтар гэтага матэрыялу зварочвае ўвагу чытачоў на дэкрэт Ю. Пілсудскага ад 22 кастрычніка 1919 г., які зацвердзіў склад і паўнамоцтвы камісіі: П. Аляксюк (старшыня), А. Аўсянік, палкоўнікі Г. Канапацкі (камандуючы беларускім войскам) і Д. Якубоўскі, штабс-капітаны Ф. Кушаль і А. Якубецкі, Ю. Мурашка, А. Прушынскі (А. Гарун), С. Рак-Міхайлоўскі, яе пастаяннае месцазнаходжанне (Мінск) і фарміраванне беларускага войска пад назвай “беларускіх нацыянальных аддзелаў” у Слоніме пад камандваннем Г. Канапацкага. Афіцэрам і салдатам беларускай нацыянальнасці было дазволена пераходзіць у беларускія часткі [2].

Ужо 12 лістапада 1919 г. газета зноў зварочвае ўвагу чытачоў на беларускую праблематыку. Было змешчана паведамленне аб накіраванні дыпламатычнага пасольства БНР на Украіну (Камянец), на чале якой знаходзіўся А. Цвікевіч [9, s. 3]. “Kurjer Polski” інфармаваў, што беларускі прадстаўнік сустрэўся з віцэ-міністрам А. Старасельскім і ўручыў адпаведныя пацвярджаючыя паперы. У маі 1919 г. Дыпламатычнае прадстаўніцтва БНР у Берліне пазначыла А. Цвікевіча дыпламатычным прадстаўніком на Украіне. У лістападзе 1919 г. кіраўніцтва БНР звярнулася да ўкраінскіх уладаў з просьбай аказаць матэрыяльную дапамогу. Місія А. Цвікевіча не дала жаданых вынікаў. Раскол Рады Народных Міністраў БНР на Народную і Найвышэйшую Раду ў снежні 1919 г. наогул зрабіў немагчымай справу беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва [3].

Беларускае пытанне з’яўляецца на старонках “Kurjera Polskiego” толькі праз працяглы тэрмін – 8 лютага 1920 г. [12, s. 4]. Менавіта ў гэты час было размешчана паведамленне аб з’яўленні ў англійскім перыядычным друку (газета “Times’is”) артыкула Ч. Рівета. Англійскі журналіст ставіць перад чытачамі праблему далейшага існавання беларускіх зямель. Ч. Рівет дае характарыстыку дзейнасці беларускіх нацыянальных колаў. Аўтар схіляецца да думкі, што палітычныя сілы беларускіх зямель дэманструюць нягнуткую палітыку, якая заключаецца ў адстойванні незалежнай лініі. Яны выступаюць рэзка супраць ўваходжання беларускіх зямель у склад ні Савецкай Расіі, ні будучай манархічнай Расіі. Як падкрэслівае Ч. Рівет, беларускія палітычныя сілы будуць “са зброяй у руках адстойваць ідэі непадзельнасці тэрыторыі Беларусі”. Праўда, як адзначае англійскі журналіст, асобныя беларускія прадстаўнікі маюць паланафільскую накіраванасць, схіляюцца да федэрацыі з Польшчай.



Репозиторий ВГУ

Пытанне лёсу беларускіх зямель неаднаразова ўздымаецца на старонках газеты ў сувязі з хуткім правядзеннем савецка-польскіх перагавораў у Барысаве (снежань 1919 г. – чэрвень 1920 г.). Так, 6 сакавіка 1920 г. выйшла паведамленне аб тым, што прадстаўнікі Цэнтральнай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны жадаюць прыняць удзел у плануемых савецка-польскіх перагаворах [13, s. 2]. Свой намер яны аргументавалі тым фактам, што на гэтых сустрэчах будзе закранацца беларускае пытанне. Аналагічнае жаданне ўтрымлівалася ў нотах пратэста Рады Народных Міністраў БНР ад 10 красавіка 1920 г. на адрас РСФСР, Польшчы, краін Антанты з патрабаваннем дапусціць беларускіх прадстаўнікоў на савецка-польскія перагаворы [1, с. 716]. Пратэстныя рашэнні былі прыняты на чарговых пасяджэннях Часовага беларускага нацыянальнага камітэта, створанага ў Мінску ў верасні 1919 г. [4, л. 7–10].

Беларускае пытанне паўставала ў рамках артыкулаў, прысвечаных асвятленню асаблівасцяў "усходняй" палітыкі Польшчы, дзейнасці Генеральнага камісарыята ўсходніх зямель (ГКУЗ). Значнае месца на старонках газеты займае пытанне арганізацыі эканамічна эфектыўнага кіравання на акупіраваных польскімі войскамі тэрыторыях. На думку аўтараў і выдаўцоў "Kurjera Polskiego" дзейнасць ГКУЗ і асабіста Е. Асмалоўскага заслугоўвае выключна крытычных адзнак. Яны заснаваны на фактах адсутнасці патрымкі з боку мясцовага насельніцтва і палітычных сіл, прыкладамі частых рэквізіцый, якія пераходзілі ў рабаванне.

12 лістапада 1919 г. з'явіўся артыкул "Генеральны камісарыят усходніх зямель" [9, s. 4]. У ім справа вырашэння "ўсходняга пытання" ставіцца ў прамую залежнасць ад пазіцыі краін Антанты і ЗША, ад поспехаў польскай ваеннай кампаніі, ад паспяховасці кіравання ГКУС. Пры гэтым далучэнне тэрыторыі Віленшчыны і Гродзеншчыны з'яўляецца больш лёгкай справай з-за прысутнасці ў дадзеным рэгіёне значнай колькасці каталіцкага насельніцтва. Значныя цяжкасці вырашэння "ўсходняга пытання" на карысць Польшчы могуць заўважацца на тэрыторыі Белай Русі, дзе пераважае праваслаўнае насельніцтва. Услед за адзначаным артыкулам 28 лістапада 1919 г. выйшаў матэрыял "Польская палітыка на ўсходніх крэсах" [10, s. 1]. У ім рэзка крытыкуецца польская ўсходняя палітыка, прыводзяцца негатыўныя бакі функцыянавання ГКУЗ. Адзначаюцца яго памылкі ў нармалізацыі сацыяльна-эканамічнага становішча акупіраваных польскімі войскамі зямель, таксама прыводзяцца недахопы ў сферы нацыянальнай і адукацыйнай палітыкі. У канцы артыкула робіцца вывад, што "такая дзейнасць ГКУЗ наносіць значную шкоду, настройвае рэзка супраць Польшчы мясцовае насельніцтва", "ва ўмовах, пакуль лёс гэтай тэрыторыі яшчэ канчаткова не вырашаны, улік волі насельніцтва мае вельмі важнае значэнне" [10, s. 1].

У тым жа русле напісаны артыкул ад 1 снежня 1919 г. "Некампетэнтнасць мясцовых улад на Беларусі" (фатальныя памылкі секцыі асветы Генеральнага камісарыята ўсходніх зямель") [11, s. 2]. У артыкуле зварочваецца ўвага чытачоў на недахопы адукацыйнай палітыкі, якая прыніжае значэнне асветы на беларускай мове. Адзначаная палітыка, у выніку, становіцца прычынай узвышэння рускамоўнай і яўрэйскай адукацыі. Паўсюль насаджаецца прынцып: польскамоўная адукацыя для каталікоў, і рускамоўнай – для праваслаўных жыхароў беларускіх зямель. Такая палітыка ў сваю чаргу прыводзіла да пратэстных настрояў сярод мясцовага насельніцтва, якое "заслугоўвае мець школу на беларускай мове" [11, s. 2]. Аўтар заўважае, што для арганізацыі нармальнага існавання беларускамоўнай адукацыі неабходна ажыццявіць падрыхтоўку настаўніцтва і выпуск адпаведных метадычных дапаможнікаў.

Немалаважнае значэнне надавалася і асвятленню грамадска-палітычнага руху на акупіраваных польскімі войскамі беларускіх землях. 6 верасня 1919 г. на старонках газеты з'явіўся артыкул, у якім асноўная ўвага зварочваецца на працу польскіх грамадскіх арганізацый, якія былі заснаваны яшчэ да ўсталявання савецкай улады [7, s. 5]. Найбольш буйнымі арганізацыямі на акупіраваных тэрыторыях называюцца: Macierz Szkolna і Wydział Oświaty Rady Ziemi Mińskiej. У асноўным яны засяроджвалі сваю дзейнасць на падрымцы польскамоўнай адукацыі. Іх праца знаходзіла фінансавую падрымку з боку польскага ўрада (30 тыс. рублёў) [7, s. 5], фактычна яны былі падпарадкаваны секцыі асветы ГКУЗ. Згодна з інфармацыяй, пададзенай у артыкуле, пад наглядам гэтых грамадскіх арганізацый знаходзіліся 405 народных (пачатковых школ) і 8 прагімназій і 4 гімназіі. Таксама ў артыкуле ўзгадваюцца Таварыства дабрачыннасці, Таварыства апекі над вязнямі, Таварыства сяброў польскага салдата, Кола поляк (Koło Połek). Яны, пасля заняцця польскімі войскамі г. Мінска (8 жніўня 1919 г.), засяродзілі

Рэпазіторый БДПУ

сваю працу вакол забеспячэння патрэб польскага войска. Яны існавалі за кошт штомесячных выплат членаў і дапамогі мецэнатаў.

Захоп значнай часткі тэрыторыі Беларусі паставіў перад польскім кіраўніцтвам не толькі пытанне арганізацыі дзейснага кіравання. Асабліва востра стала дылема працягу ваенных дзеянняў і пытанне далейшага прасоўвання на ўсход. Так, 20 жніўня 1919 г. выйшаў артыкул "Польскія войскі дасягнулі р. Бярэзіны", прысвечаны адзначаным пытанням [6, s. 2]. На першы план выступае не праблема арганізацыі нармальнага функцыянавання ГКУЗ і кіравання акупіраванымі тэрыторыямі, а пытанне атрыманне фінансавай і ваеннай дапамогі з боку краін Антанты і ЗША. Польская дзяржава прадстае перад намі як адзіная краіна, якая не спыніла вайну з Савецкай Расіяй. Хоць, як адзначае аўтар, гэтая барацьба выклікала значныя эканамічныя і палітычныя выдаткі. Аўтар артыкула не пагаджаецца з меркаваннямі шматлікіх экспертаў, якія заяўляюць, што кожная краіна, якая пастаўлена перад пагрозай бальшавізма, павінна вырашаць гэтую праблему самастойна ў рамках асобнай дзяржавы. Так як бальшавізм з'яўляецца пагрозай для ўсяго цывілізаванага свету.

Такім чынам беларускае пытанне неаднаразова трапляе ў сферу разгляду аўтараў "Kurjera Polskiego". У асноўным яно разглядаецца ў рэчышчы федэралістычнай канцэпцыі Польскай дзяржавы. Вырашэнне беларускага пытання ставіцца ў прамую залежнасць ад рэалізацыі ў цэлым федэралістычных планаў па ўзнаўленню Рэчы Паспалітай. Беларускія нацыянальныя арганізацыі і палітычныя сілы разглядаюцца ў выглядзе мала ўплывовых і аўтарытэтных. Менавіта таму яны не могуць праводзіць самастойнай палітыкі і вымушаны зварочваецца за падтрымкай да польскага кіраўніцтва. Непаспяховасць "ўсходняй палітыкі" Польшчы цалкам ускладваецца на кіруючыя колы Генеральнага камісарыята ўсходніх зямель і асабіста Е. Асмалоўскага.

1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: у 2 кн. : Кн. 1. : 1917–1925 гг. / склад. С. Шупа. − Вільня–Нью-Ёрк–Менск–Прага, 1998. – Ч. 1 : 1917–1920. – 870 с.
2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 159.
3. Зубко, В. Знешнепалітычная чыннасць Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1919–1920 гг. ва ўкраінскай інтэрпрэтацыі / В. Зубко // Гістарычны альманах. – 2003. – № 8. – С. 107–117.
4. Пратакол пасяджэння Цэнтральнай Рады Віленшчыны і Гродзеншчыны 19 верасня 1919 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 368. Воп. 1. Спр. 24.
5. Dokumenty i materiały do historii stosunków polsko-radzieckich : w 41 t. / pod. red. W. Gostyńską. – 1961. – T. 2 : Listopad 1918 – kwiecień 1920. – 889 s.
6. Kurjer Polski. – 20 sierpnia 1919 r. – № 215.
7. Kurjer Polski. – 6 września 1919 r. – № 232.
8. Kurjer Polski. – 1 listopada 1919 r. – № 287.
9. Kurjer Polski. – 12 listopada 1919 r. – № 297.
10. Kurjer Polski. – 28 listopada 1919 r. – № 313.
11. Kurjer Polski. – 1 grudnia 1919 r. – № 316.
12. Kurjer Polski. – 8 lutego 1920 r. – № 38.
13. Kurjer Polski. – 6 marca 1920 r. – № 65.

**Яковлева Г.Н.**

## РЕКЛАМА И ОБЪЯВЛЕНИЯ В ГАЗЕТАХ г. ВИТЕБСКА КАК ИСТОЧНИК ПО ПОВСЕДНЕВНОЙ ЖИЗНИ 1920-х гг.

Российский исследователь В. Рынков, говоря о значимости периодической печати как источника, отмечал, что она дает возможность: «во-первых, анализировать многоаспектный комплекс источников, сформировавшихся в процессе жизнедеятельности общества, в рамках определенной политической, идеологической или ведомственной направленности (в силу того, что редакция целенаправленно определяет совокупность и порядок публикаций); во-вторых, включаться в жизненный мир определенной местности, организации, группы людей… В этом уникальность периодики, объясняющая необходимость и целесообразность ее изучения как самостоятельного феномена. Такой подход позволяет глубже анализировать круг источников, которые историки извлекают из газет и журналов, задает совершенно другие параметры источниковедческой критики. «Источниковой» единицей в этом случае должна выступать каждая отдельная публикация, а не издание в целом (газета, журнал), что позволит определить все многообразие опубликованных в прессе материалов и специфику каждого из них» [2].

Репозиторий ВГУ